# Пераемнікі Віленскага ўніверсітэта: медыка-хірургічная і рымска-каталіцкая духоўная акадэміі (арганізацыйна-фінансавыя аспекты стварэння і дзейнасці)

**А. У. Ерашэвіч,**
дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт

*Вышэйшая адукацыя ў Беларусі мае глыбокія карані і багатыя традыцыі. У першай трэці XIX ст. патрэбы моладзі з беларускіх зямель у атрыманні ведаў забяспечваў імператарскі разгалінаваны Віленскі ўніверсітэт – асноватворны цэнтр вышэйшай адукацыі і навукі краю, які па ўзроўні выкладання і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі ў пэўных прадметных галінах займаў адно з вядучых месцаў сярод універсітэтаў Расійскай імперыі. На базе ліквідаванага ў 1832 г. Віленскага ўніверсітэта яшчэ 10 гадоў працягвалі працаваць яго пераемнікі – медыка-хірургічная і рымска-каталіцкая духоўная акадэміі. Пасля закрыцця віленскіх акадэмій беларуска-літоўскія губерні сталі адзінымі з рэгіёнаў Расійскай імперыі, якія да савецкага часу не мелі ўніверсальнага, не ўлічваючы вышэйшых спецыяльных прафесійных навучальных устаноў, асяродка падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў з вышэйшай ступенню адукацыі.*

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 11.05.2022.

У пачатку XX ст. з друку выйшла некалькі артыкулаў расійскіх і польскіх гісторыкаў, якія датычыліся абставін закрыцця Віленскага ўніверсітэта [1–3]. Гісторыі пераемнікаў Віленскага ўніверсітэта – медыка-хірургічнай і рымска-каталіцкай духоўнай акадэмій – прысвечана некалькі даследаванняў польскіх навукоўцаў. Так, польскі гісторык медыцыны Ю. Бялінскі правёў значную работу па рэканструкцыі асабовага складу выкладчыкаў і выпускнікоў Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі, склаўшы падрабязны слоўнік персаналій [4]. У цэлым, хоць да вывучэння арганізацыі і дзейнасці віленскіх акадэмій, укладу іх выпускнікоў у развіццё адукацыі, навукі і культуры, пытання ўдзелу іх выхаванцаў у антыўрадавай дзейнасці і звярталіся даследчыкі розных эпох і краін, але яны не надавалі належнай увагі арганізацыйна-фінансавым аспектам стварэння, функцыянавання і скасавання віленскіх акадэмій – пераемніц адукацыйных традыцый Віленскага ўніверсітэта. Для дасягнення цэласнай карціны, усебаковай характарыстыкі гэтых цэнтраў вышэйшай адукацыі беларускіх зямель неабходна запоўніць лакуну ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі ў сфармуляваным аўтарам кантэксце, а таксама выправіць некаторыя недакладнасці, якія прысутнічаюць у навуковых даследаваннях, уключаючы адзіную спецыяльную публікацыю гісторыка беларускай адукацыі А. Ф. Самусіка, што датычыцца дадзенай тэмы [5].

Мэта артыкула – аналіз фінансавага забеспячэння арганізацыі і дзейнасці віленскіх акадэмій у 30-х – пачатку 40-х гг. XIX ст. праз высвятленне крыніц іх даходаў, колькасных паказчыкаў складу і структуры грашовага ўтрымання медыка-хірургічнай і рымска-каталіцкай духоўнай акадэмій. Для рэалізацыі мэты былі выкарыстаны разнастайныя крыніцы: пераважна апублікаваныя заканадаўчыя акты, афіцыйна-спраўаводныя матэрыялы, мемуары.

У сувязі з арганізацыяй антыўрадавых выступленняў і ўдзелу 417 студэнтаў у паўстанні 1830–1831 гг. выйшаў імператарскі ўказ аб закрыцці Віленскага ўніверсітэта з 01.05.1832 г. [6, т. 7, № 5317, с. 225; 7, аддз. 1, стб. 476–478]. Яго медыцынскі і багаслоўскі факультэты перадаваліся Міністэрству ўнутраных спраў для перайменавання і пераўтварэння ў Медыка-хірургічную акадэмію і вышэйшае духоўнае вучылішча. Сенатар М. М. Навасільцаў выказаў меркаванне аб рэарганізацыі Віленскага ўніверсітэта ў закрыты кадэцкі корпус, але яго прапанова не атрымала падтрымкі.

Благанадзейных у палітычных адносінах прафесараў і іншых выкладчыкаў прадпісвалася размеркаваць у іншыя расійскія ўніверсітэты з ранейшымі акладамі, выплачваемымі з агульнага паезуіцкага фундуша, а грамадзянскіх і іншых чыноўнікаў звольніць.

З 52 прафесараў універсітэта для выкладання вучэбных прадметаў былі пакінуты 31 (24 – у медыцынскай акадэміі, 7 – у духоўным вучылішчы), 21 прафесар быў звольнены [1, с. 3–6, 16]. Міністр народнай асветы К. А. Лівен загадаў выдаць прафесарам і чыноўнікам, акрамя тых, хто застаўся працаваць на медыцынскім факультэце, палову штогадовага ўтрымання ў памеры каля 23 260 руб. серабром. У прадстаўленні Міністэрства народнай асветы ад 12.04.1832 г. гаварылася, што прафесарам і чыноўнікам былога Віленскага ўніверсітэта, якія ўжо выслужылі 25 год, неабходна было прызначыць эмерыту (заслужаную пенсію), а іншым выплачваць адпаведна колькасці гадоў адбытай службы аднаразовую дапамогу. На гэта выдаткоўвалася ў 7450 руб. серабром штогод і 10 175 руб. серабром аднаразова [2, s. 244].

Вырашаўся таксама лёс розных дапаможных адміністрацыйных і навучальна-навуковых устаноў пры Віленскім універсітэце: архіва адукацыйнага фундуша, інстытута практычнай сельскай гаспадаркі, інстытута глуханямых, астранамічнай абсерваторыі, літаграфіі, бенефіцыяльнага маёнтка і цэнзурнага камітэта. Архіў адукацыйнага фундуша быў перададзены Міністэрству народнай асветы, а 21.04.1834 г. паступіў у агульную масу казённых капіталаў з выдачай узамен Міністэрству народнай асветы 200 000 руб. серабром штогод [3, с. 68–69].

Перад закрыццём акладны штогадовы даход Віленскага ўніверсітэта з паезуіцкіх маёнткаў складаў 292 497 руб. 98,25 кап. серабром, 3686 руб. 20,25 кап. асігнацыямі, 326 паўімперыялаў золатам. Тым не менш з 1808 да 1831 г. недабралі 434 157 руб. 98 кап. серабром (за 23 гады да 1,5 сумы штогадовага ўтрымання), 3570 руб. 72 кап. асігнацыямі. У 1831 г. ва ўніверсітэцкую касу прыбыло яшчэ 140 562 руб. 47 кап. серабром і 2843 руб. 20,25 кап. асігнацыямі. Утрыманне медыцынскага факультэта каштавала 48 940 руб. 75 кап. серабром, у тым ліку 22 240 руб. 75 кап. серабром адпускалася па штаце ад 15.11.1820 г. для ўтрымання 100 казённых выхаванцаў у асобным медыцынскім інстытуце пры Віленскім універсітэце, часткова з агульных даходаў гэтай вышэйшай навучальнай установы [2, s. 252; 3, с. 59].

Неабходнасць адкрыцця ў Вільні на базе медыцынскага факультэта ранейшага Віленскага ўніверсітэта спецыяльнай медыцынскай вышэйшай навучальнай установы матывавалася вострай патрэбай у кваліфікаваных медыцынскіх кадрах для расійскай сухапутнай арміі і флоту, вэтэрынараў для развіцця жывёлагадоўлі і асабліва конегадоўлі, фармацэўтаў і майстроў спавівальнага мастацтва для павелічэння дэмаграфічнага патэнцыялу краіны ў цэлым. Да таго ж большасць студэнтаў медыцынскага факультэта ў час паўстання 1830–1831 гг. вялі сябе стрымана, не паддаліся агітацыйным заклікам агітатараў антыўрадавых выступленняў і не падтрымалі польскую нацыянальную ідэю. Акрамя таго, у Віленскім універсітэце меліся багатыя педагагічныя традыцыі падрыхтоўкі лекараў, навуковыя школы ў розных галінах медыцынскіх ведаў, разнастайнае абсталяванне і неабходныя рэчы для правядзення практычных заняткаў.

Пасля атрымання імператарскага ўказа аб ліквідацыі Віленскага ўніверсітэта К. А. Лівен у рапарце абазначыў грашовую квоту ў 86 647 руб. серабром штогод для падтрымкі штату медыка-хірургічнай акадэміі. Разгледзеўшы складзеныя К. А. Лівенам штаты, міністр унутраных спраў зменшыў праектаваны штат медыка-хірургічнай акадэміі на 15 000 руб. (за кошт ліквідацыі кафедраў рускай, лацінскай, французскай і нямецкай моў, скарачэння акладаў ардынарных прафесараў да 1200 руб. серабром штогод замест мяркуемай выдачы ў 1500 руб. серабром) і абмежаваў яго сумай у 71 000 руб. серабром штогод [2, s. 243; 3, с. 60].

Імператар Мікалай I 31.08.1832 г. замацаваў сваёй станоўчай рэзалюцыяй устаў і штат імператарскай Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі, якія былі распрацаваны апошнім рэктарам Віленскага ўніверсітэта медыкам В. Пеліканам на ўзор Санкт-Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі, складзены міністрам унутраных спраў і разгледжаны ў Дзяржаўным савеце [4, s. 16–49; 6, т. 7, № 5584, с. 571–591]. Згодна з пунктамі палажэння арганізацыйна-штатнай структуры, у склад медыка-хірургічнай акадэміі ўваходзілі прэзідэнт, інспектар, 4 яго памочнікі, саветнік праўлення, сакратары, канцылярскія чыноўнікі, 15 ардынарных прафесараў (праз не менш 10 гадоў беззаганнай службы станавіліся акадэмікамі пасля зацвярджэння імператара) і 10 ад’юнктаў. Выбраныя канферэнцыяй медыка-хірургічнай акадэміі прафесары зацвярджаліся міністрам унутраных спраў. Канферэнцыя з акадэмікаў і прафесараў мела права надання 15 навуковых ступеняў і званняў, прысваення звання акадэміка, выбірала ардынарных і экстраардынарных прафесараў і ад’юнктаў, ганаровых членаў і карэспандэнтаў, размяркоўвала навучальныя дысцыпліны, разглядала вучэбныя праграмы, вызначала правілы прыёму, унутранага распарадку, прыёмных і выпускных экзаменаў і інш. Паступаць у медыка-хірургічную акадэмію маглі асобы свабодных станаў з 17 гадоў з гімназічным дыпломам альбо пасля праходжання папярэдняга іспыту па праграме гімназіі. Пазней, у канцы 1834 г., была прынята пастанова аб тым, што папярэднія іспыты павінны былі вытрымліваць усе, хто паступаў. Вучні падзяляліся на казённых выхаванцаў, стыпендыятаў, пансіянераў і вольных слухачоў. Пасля заканчэння вышэйшай

медыцынскай навучальнай установы выхаванцы, прынятыя на казённы кошт, павінны былі адслужыць па прызначэнні ўрада не менш за шэсць гадоў. У медыка-хірургічную акадэмію ў Вільні планавалі набіраць за кошт дзяржаўнага ўтрымання ўдвая больш студэнтаў, чым у былым Віленскім універсітэце, альбо да 200 казённых выхаванцаў па медыцынскай частцы і 30 – па ветэрынарнай (10 чалавек першага разраду і 20 – другога). Навучанне вялося на рускай ці лацінскай мове. Польская мова, па меркаванні канферэнцыі і з дазволу міністра ўнутраных спраў, дапускалася толькі пры выкладанні жанчынам спавівальнага мастацтва і навучанні вучняў 2-га разраду фармацэўтычным і ветэрынарным навукам. Замест медыцынскага факультэта з пяцігадовым тэрмінам навучання ранейшага Віленскага ўніверсітэта ў медыка-хірургічнай акадэміі ўтвараліся аддзяленні медыцынскае (з пяцігадовым), ветэрынарнае (з чатырохгадовым), фармацэўтычнае і спавівальнага мастацтва (з трохгадовым). Выкладанне ветэрынарных навук для вучняў 2-га разраду было разлічана на тры гады. Выхаванцы павінны былі папярэдне наведваць сярэднія навучальныя медыцынскія ўстановы – школы акушэрства, фармацэўтычную і ветэрынарыі. Ветэрынарны інстытут у медыка-хірургічнай акадэміі ў Вільні быў адным з першых у Расійскай імперыі. Пры Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі было шмат навучальна-навуковых дапаможных устаноў: бібліятэка, кабінеты фізічны, мінералагічны, заалагічны, параўнаўчай анатоміі, анатамічны і анатамічна-паталагічны, фармакалагічны, анатоміі дамашніх жывёл, хімічная лабараторыя, зборы хірургічных інструментаў і мадэляў машын, акулістычных прылад, акушэрскіх, ветэрынарных інструментаў і лекаў, батанічны сад, аптэка з уласнай фармацэўтычнай лабараторыяй, хірургічная клініка з асобным аддзяленнем для хвароб вачэй на 20 ложкаў, медыцынская клініка на 20 ложкаў, акушэрская клініка і для дзіцячых і жаночых хвароб на 12 ложкаў, ветэрынарны лазарэт і кузня.

На ўтрыманне Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі з Віленскага павятовага казначэйства штогод выдаткоўвалася 365 520 руб. асігнацыямі ці 104 434 руб. 28 кап. серабром, у лік якіх з дзяржаўнага казначэйства паступала 22 240 руб. 75 кап. (21,3 %), а астатнія 82 193 руб. 53 кап. серабром (78,7 %) – з адукацыйнага фундуша, акрамя выдачы дадатковага жалавання прафесарам былога Віленскага ўніверсітэта ў памеры 1999 руб. 6 кап. серабром [8, с. 405]. Пасля перакладу асігнацый на серабро ў 1839 г. на Віленскую медыка-хірургічную акадэмію адпускалася 104 465 руб. 50 кап. серабром, а пасля вылічэння 859 руб. 96 кап. на карысць дзяржаўнага казначэйства і 11 руб. 44 кап. адлічэнняў у інвалідны капітал да выдачы належала 103 594 руб. 10 кап. [6, т. 15-2, к № 14106, с. 949–951, 976]. Такім чынам, у параўнанні з былым медыцынскім факультэтам Віленскага ўніверсітэта памеры грашовага ўтрымання Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі выраслі больш чым у 2,1 раза, амаль на столькі ж, на колькі павялічваўся набор казённых выхаванцаў (у 2,3 раза).

Згодна са штатным роспісам [6, т. 7, к № 5584, с. 95–96], прыкладная структура ўтрымання Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі, па нашых падліках, выглядала наступным чынам: на ўтрыманне 230 казённых выхаванцаў асігнавалася 113 000 руб. (30,9 %), на забеспячэнне жалаваннем прафесарска-выкладчыцкага складу – 99 000 руб. (27,1 %), на патрэбы дапаможнага вучэбнага персаналу і ўтрыманне дадатковых навукова-адукацыйных устаноў (так званых кабінетаў, тэатраў, лабараторый, бібліятэкі, батанічнага саду, трох клінік, ветэрынарнага лазарэту і інш.) – 55 700 руб. (15,2 %), на гаспадарчыя выдаткі – 54 750 руб. (15 %). З адміністрацыйнага апарату выдаткоўвалася 43 070 руб. (11,8 %). Такім чынам, асноўныя фінансавыя сродкі прызначаліся для забеспячэння студэнтаў і выкладчыкаў.

На ўтрыманне кожнага з 200 казённых студэнтаў-медыкаў (на харчаванне, адзенне, пасцель, бялізну, пакаёвую мэблю, навучальныя дапаможнікі, узнагароды кнігамі і медалямі) і 10 ветэрынарных вучняў 1-га разраду адлічвалася па 500 руб., а 20 ветэрынарных вучняў 2-га разраду – па 400 руб. асігнацыямі. 09.11.1837 г. было зацверджана меркаванне Дзяржаўнага савета аб утрыманні ў Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі замест 20 дзяржаўных ветэрынарных выхавальнікаў 2-га разраду 16 казённых ветэрынарных выхавальнікаў 1-га разраду коштам у 500 руб. [6, т. 12-2, № 10682, с. 881–882]. На так званае абмундзіраванне казённым лекарам адпускалася па 200 руб., а ветэрынарам – па 150 руб. асігнацыямі штогод, а фактычна – па 10 руб. у месяц (120 руб. у год). Але з агульнай вызначанай грашовай квоты ўтрымання на аднаго казённага выхаванца на рукі студэнт атрымліваў толькі чацвёртую частку штатнай сумы [4, s. 29, 51–52; 9, s. 3]. У 1834 г. бедныя вольныя слухачы Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі былі вызвалены ад абавязку аднаразовага 25-рублёвага ўзносу грошай [6, т. 9-1, № 7180, с. 447]. Штогадавое жалаванне ардынарнага прафесара складала 5000 руб., ад'юнкта – 2000 руб. асігнацыямі. У 1834 г. у Віленскую медыка-хірургічную акадэмію для пачатковага навучання рускай мове ветэрынарных вучняў 2-га разраду і некаторых студэнтаў-медыкаў быў прызначаны асобны настаўнік рускай мовы з штогадовым жалаваннем у 1000 руб. асігнацыямі з агульных рэштак акадэмічных сум [6, т. 9-1, № 7110, с. 393]. Калі экстраардынарныя прафесары і ад'юнкты чыталі лекцыі замест ардынарных прафесараў, то

яны не атрымлівалі жалаванне апошніх, а набывалі ў канцы года толькі аднаразовыя выдачы з рэштkaў штатных акадэмічных сум, але каб яны не пераўзыходзілі трэць поўнага акладнога жалавання ардынарнага прафесара [6, т. 8-1, № 5911, с. 31–32]. Акадэмікі і прафесары пасля 18 гадоў службы па ўласным жаданні маглі выйсці ў адпачынак з выплатай ім пажыццёва палавіны акладнога і дадатковага жалавання.

У першы навучальны год у Віленскую медыка-хірургічную акадэмію набралі 625 студэнтаў, праз год – 793, а ў 1835 г. – 865. У 1836 г. з 599 навучэнцаў было 187 казённых (31,2 %) і 412 вольных (68,8 %), у тым ліку з Віленскай губерні – 178, Мінскай – 104, Гродзенскай – 56, Беластоцкай вобласці – 45, Віцебскай губерні – 12, Магілёўскай – 2 [10, с. 44, 45], гэта значыць, што 397 студэнтаў (66,3 %) паходзілі з беларуска-літоўскіх зямель. У 1839 г. у Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі было 380 студэнтаў, уключаючы 161 казённакоштнага (42,4 %), 217 вольных (57,1 %), 1 стыпендыята, 1 пансіянера (0,5 %) [11, l. 63]. Такім чынам, у Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі пераважалі платныя навучэнцы, а колькасць казённых выхаванцаў не дасягала штатнага ўзроўню. Прычынай гэтага было імкненне маладых людзей пазбегнуць цяжкасцей абавязковай адпрацоўкі на пасадах дзяржаўнай службы без права выбару яе месца і пасады прызначэння.

Віленская медыка-хірургічная акадэмія праіснавала нядоўга. Выкрыццё арганізаванай Ф. А. Савічам тайнай рэвалюцыйнай арганізацыі пад назвай «Дэмакратычнае таварыства» (1836–1838) прадвызначыла яе далейшы лёс. Прыхільнікі нелегальнага студэнцкага таварыства перасьледавалі не толькі палітычныя (ліквідацыя самадзяржаўя і пераход да дэмакратычнай рэспублікі) і сацыяльныя (дасягненне ідэалаў сацыяльнай свабоды і роўнасці сярод сялян і рамеснікаў) мэты, падтрымлівалі прынцып інтэрнацыяналізму (выступалі за рэвалюцыйны саюз брацкіх народаў), але і з'яўляліся прыхільнікамі пераадолення заганаў грамадства, імкнуліся рэалізаваць шэраг навукова-асветных, дабрачынных, духоўна-маральных задач (дамагаліся маральнага ўдасканалення асоб, выступалі за распаўсюджванне асветы сярод простага народа, падтрымлівалі ідэю ўзаемнай дапамогі). Царскія ўлады вырашылі закрыць чарговы ачаг вальнадумства, распаўсюджвання ў Вільні грамадска-палітычных ідэй, забароненай польскай патрыятычнай літаратуры.

15.05.1840 г. было абвешчана аб спыненні прыёму навучэнцаў у Віленскую медыка-хірургічную акадэмію. Згодна з пастановай ад 30.07.1840 г., першыя тры медыцынскія і першы ветэрынарны класы былі закрыты, а казённых студэнтаў было вырашана перавесці ў Харкаўскі і Казанскі ўніверсітэты. Аднаго студэнта было загадана выключыць, 14 – звольніць, а 13 казённакоштных выхаванцаў перавесці ў Казанскі і Харкаўскі ўніверсітэты з асігнаваннем ім штатных грошай для сканчэння поўнага курса навучання. Своекоштным студэнтам скасоўваемых класаў, якія б пажадалі працягнуць вучобу ў іншых вышэйшых навучальных установах, выдавалі з эканамічных сум Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі на прагоны на каня па палажэнні кожнаму сутачных па 25 кап. серабром у дзень і на пад'ём па 3 руб. серабром. Для забеспячэння 19 зусім бедных студэнтаў засноўваліся стыпендыі ў памеры ад 60 да 80 руб. серабром на кожнага выхаванца, а для маёмасна недастатковых (да 40 чал.) – штогадовую грашовую дапамогу ад 40 да 50 руб. на кожнага студэнта з эканамічных сум акадэміі. Прафесары маглі працягваць працу ў розных расійскіх універсітэтах. Выкладчыкаў, якіх не пераводзілі ў іншыя навучальныя ўстановы, звальнялі са службы з прызначэннем ім пенсій ці з выдачай аднаразовага гадавога акладу жалавання з дзяржаўнага казначэйства ў тым выпадку, калі яны не маглі яшчэ разлічваць на законную пенсію [7, аддз. 2, стб. 91–98].

Пасля ліквідацыі першых трох медыцынскіх курсаў і першага ветэрынарнага класа, згодна з зацверджаным 30.12.1841 г. палажэннем Камітэта міністраў, Віленская медыка-хірургічная акадэмія з 01.08.1842 г. канчаткова была закрыта, паколькі арганізоўваўся медыцынскі факультэт пры ўніверсітэце св. Уладзіміра ў Кіеве. Студэнты маглі завяршыць навучанне ў любой вышэйшай навучальнай установе імператарскай Расіі, акрамя Кіеўскага ўніверсітэта. Пакінутыя сумы медыка-хірургічнай акадэміі аддаваліся ў распараджэнне Міністэрства народнай асветы на будаўнічыя патрэбы навучальных устаноў, пераважна для завяршэння будаўніцтва будынкаў універсітэта св. Уладзіміра ў Кіеве [7, аддз. 2, стб. 296–302].

За кароткі час свайго функцыянавання Віленская медыка-хірургічная акадэмія змагла працягнуць навукова-педагагічныя традыцыі медыцынскай адукацыі і навукі былога Віленскага ўніверсітэта. У Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі выкладалі прафесары, якія паходзілі з беларускіх зямель [4, s. 549, 564–567, 571–573, 589–595]. За дзесяць гадоў існавання Віленская медыка-хірургічная акадэмія выпусціла 963 спецыяліста, у тым ліку 747 з дыпломам медыка, 183 – ветэрынара, 33 – фармацэўта. З 747 спецыялістаў-медыкаў 307 (41,1 %) знаходзіліся доўгатэрмінова і 48 (6,4 %) – кароткатэрмінова ў расійскай арміі, 164 (22 %) – на цывільнай службе, у тым ліку 98 чалавек (13,1 %) праходзілі яе ў заходніх губернях, 228 (30,5 %) аддаваліся вольнай медыцынскай практыцы [4, s. 610–753]. Іншымі словамі, Віленская медыка-хірургічная акадэмія з'яўлялася цэнтрам падрыхтоўкі медыцынскіх спецыялістаў для патрэб ваеннай і грамадзянскай службы імператарскай Расіі

ў цэлым, прычым толькі 13,1 % казённых выхаванцаў праходзілі цывільную службу ў заходніх і яшчэ менш – у беларускіх губернях. На базе бібліятэкі (больш за 20 000 тамоў), абсталяванняў кабінетаў, збору гербарыя Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі быў утвораны медыцынскі факультэт Кіеўскага ўніверсітэта.

З мэтай падпарадкавання працэсу падрыхтоўкі кадраў для рымска-каталіцкай царквы адміністрацыйнаму ўрадаваму кантролю, ізалявання рымска-каталіцкага кіраўніцтва ад іншаземнага ўплыву Ватыкана і абмежавання ўздзеяння вышэйшых царкоўных іерархаў над прыходскім каталіцкім духавенствам беларуска-літоўскага краю было прынята рашэнне аб адкрыцці на базе багаслоўскага факультэта былога Віленскага ўніверсітэта Віленскай рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі.

У вышэйшае рымска-каталіцкае багаслоўскае вучылішча ўключаліся былая Галоўная і Віленская епархіяльная семінарыі і нанова заснаванае аддзяленне для навучання клірыкаў армяна-каталіцкага веравызнання. У Віленскую епархіяльную семінарыю паступалі 60 клірыкаў з Віленскай епархіі на фундушавым утрыманні, а на армяна-каталіцкае аддзяленне – 7 клірыкаў на казённым утрыманні. Такім чынам, Віленская духоўная епархіяльная семінарыя і духоўнае вучылішча для армяна-католікаў пры ёй былі разлічаны на 67 выхаванцаў, а на вышэйшае аддзяленне Віленскай духоўнай акадэміі прымалі 40 клірыкаў на фундушавым утрыманні. У 1833 г. прызначалася 40 стыпендый з рымска-каталіцкіх дыяцэзій, у тым ліку па 9 з Магілёўскай і Віленскай, 6 – з Мінскай [12, s. 222]. Тэрмін навучання ў семінарыі і акадэміі складаў тры гады. У 1839 г. курс навучання быў павялічаны з трох да чатырох гадоў [6, т. 14-1, № 12219, с. 355]. Навучальны працэс для 40 семінарыстаў з былой Віленскай Галоўнай семінарыі і 60 семінарыстаў з рымска-каталіцкіх дыяцэзій забяспечвалі 10 кафедр і 7 прафесараў, 4 ад'юнкты, 3 лектары. Праўленне духоўнай акадэміі падпарадкоўвалася Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі Міністэрства ўнутраных спраў. У склад яго ўваходзілі рэктар, інспектар, 2 прафесары-прарэктары і аканом [6, т. 8-1, № 6296, с. 386–390]. Савет (канферэнцыя) прафесараў духоўнай акадэміі мог надаваць вучоныя ступені студэнтаў, кандыдатаў, магістраў, дактароў багаслоўя і дактароў кананічнага права.

Згодна з зацверджаным 01.07.1833 г. імператарам уставам штатная сума ўтрымання Віленскай рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі дасягала 102 234 руб. асігнацыямі. На фінансавае забеспячэнне яе дзейнасці прызначаўся фундуш Віленскай епархіяльнай семінарыі, двое брэсцкіх семінарыстаў, бенефіцыяльныя маёнткі, якія знаходзіліся ў ведамстве былога Віленскага ўніверсітэта (ленны маёнтак Ляхавічы Слуцкага павета і Колпеніцы Навагрудскага павета), сумы з капіталаў скасаваных рымска-каталіцкіх манастыроў [6, т. 8-1, № 6296, с. 386]. Міністэрская пастанова ад 27.06.1833 г. растлумачвала, што для ўтрымання духоўнай акадэміі павінны былі паступаць даходы з фундуша Віленскай епархіяльнай семінарыі і духоўных бенефіцый, якія, згодна з актам ад 04.04.1803 г., знаходзіліся ў распараджэнні Віленскага ўніверсітэта. Дадаткова адлічвалася 4500 руб. серабром штогод з адукацыйнага фундуша замест жалавання прафесарам багаслоўскага факультэта. Да 01.06.1832 г. у Віленскую казённую палату паступіла з бенефіцыяльных даходаў больш за 33 000 руб. серабром і з манастырскай складчыны на Віленскую Галоўную семінарыю 4000 руб. серабром [7, аддз. 1, стб. 603–604]. У 1839 г. у публічную касу Віленскай рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі, акрамя 102 234 руб. асігнацыямі штатных, прыбыло 7100 руб., разам 31 238 руб. 14 кап. серабром. У 1840 г. яе даход павялічыўся да 48 402 руб. 25 кап. серабром [12, s. 24].

Віленская рымска-каталіцкая духоўная акадэмія пачала працаваць 11.02.1834 г. У цэлым на ўтрыманне 107 клірыкаў адпускалася 42 800 руб. (41,9 %), на жалаванне выкладчыкам – 27 600 руб. (27 %), адміністратарам-чыноўнікам і служыцелям выплачвалася 17 000 руб. (16,6 %), на гаспадарчыя патрэбы – 12 000 руб. (11,7 %), на бібліятэку – 1500 руб. (1,5 %), на падарожныя выдаткі навучэнцам і прафесару гігіены – 1334 руб. асігнацыямі (1,3 %). Утрыманне аднаго навучэнца каштавала 400 руб. Прафесары атрымлівалі па 3000 руб., ад'юнкты – па 1500 руб., лектары – па 1200 руб. асігнацыямі акладнога штогадовага жалавання [6, т. 8-2, № 6296, с. 144]. З-за павелічэння тэрміну навучання ў Віленскай рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі ў 1839 г. з трох да чатырох гадоў для дапамогі ў выкладанні прадметаў да кафедр Святога Пісання і багаслоўя былі прыпісаны 2 ад'юнкты з жалаваннем па 1500 руб. асігнацыямі, настаўнік царкоўных спеваў і абрадаў з утрыманнем у 600 руб. асігнацыямі, 2 наглядчыкі для дапамогі інспектару з выдачай ім па 1000 руб. асігнацыямі кожнаму. Прафесару ўсеагульнай і расійскай гісторыі прызначалася поўнае прафесарскае жалаванне ў 3000 руб. асігнацыямі штогод на кошт фундуша [6, т. 14-1, № 12219, с. 355–356]. На свецкіх выкладчыкаў і чыноўнікаў Віленскай рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі распаўсюджваліся правілы прызначэння пенсій і аднаразовых дапамог [6, т. 14-1, № 12456, с. 567].

У 1839 г. у Віленскай рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі налічвалася 42 казённакоштных і 2 сваякоштных выхаванцаў, у Віленскай епархіяльнай семінарыі – адпаведна 56 і 2. Навучанне ў абедзвюх навучальных установах вялі 24 выкладчыкі [11, l. 63v].

Цэнтр падрыхтоўкі святароў для рымска-каталіцкай і армяна-каталіцкай цэркваў у Вільні таксама дзейнічаў нядоўга. З мэтай пазбаўлення прамога ўплыву на навучальна-выхаваўчы працэс мясцовага вышэйшага рымска-каталіцкага духавенства ў 1842–1844 гг. Віленская рымска-каталіцкая духоўная акадэмія была пераведзена далёка ад заходніх губерняў – у сталіцу Расійскай імперыі, у якой на яе аснове была адкрыта Санкт-Пецярбургская рымска-каталіцкая духоўная акадэмія, якая праіснавала да 1918 г.

Такім чынам, з прычыны лаяльнасці студэнтаў і пільнай неабходнасці ў падрыхтоўцы кваліфікаваных медыкаў для патрэб у першую чаргу ўзброеных сіл Расійскай імперыі, а таксама багаслоўскіх спецыялістаў для рымска-каталіцкай царквы ў Вільні замест універсітэцкага цэнтра вышэйшай адукацыі былі адкрыты спецыялізаваныя акадэміі з вышэйшай ступенню адукацыі – медыка-хірургічная і рымска-каталіцкая духоўная, якія пазбаўляліся пэўных акадэмічных прывілеяў, абмяжоўваліся іх правы на самакіраванне і ўсталёўваўся больш жорсткі ўрадавы кантроль за дзейнасцю выкладчыкаў і паводзінамі навучэнцаў. Гэтыя вышэйшыя навучальныя ўстановы з'яўляліся пераемніцамі багатых навукова-педагагічных традыцый Віленскага ўніверсітэта з поўным цыклам падрыхтоўкі спецыялістаў.

Па-ранейшаму асноўнымі крыніцамі іх утрымання былі не фінансавыя сродкі дзяржаўнага казначэйства, а мэтавыя адлічэнні з адукацыйнага фундуша (уваходзілі ў асаблівую групу агульнагубернскіх спецыяльных, але не казённых даходаў). У структуры грашовага ўтрымання гэтых цэнтраў вышэйшай адукацыі па падрыхтоўцы прафесійных медыцынскіх работнікаў і кваліфікаваных кадраў для рымска-каталіцкай царквы ў краі пераважалі адлічэнні на ўтрыманне казённых студэнтаў і грашовую падтрымку выкладчыкаў. Закрытыя па палітычных матывах віленскія акадэміі сталі базай для арганізацыі медыцынскага факультэта ў Кіеве і рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу.

### Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Довгялло, Д. И.* Последняя страница истории Виленского университета / Д. И. Довгялло. – Вильна: Тип. И. Завадского, 1914. – 20 с.
2. *Mościcki, H.* Zniesienie Uniwersytetu Wileńskiego / H. Mościcki // Biblioteka Warszawska. – 1910. – T. 2. – S. 232–262.
3. *Пантелеев, Л.* Закрытие Виленского университета / Л. Пантелеев // Русское богатство. – 1909. – № 11. – С. 45–69.
4. *Bieliński, J.* Stan nauk lekarskich za czasów Akademii Medyko-Chirurgicznej Wileńskiej, bibliograficznie przedstawiony. Przyczynek do dziejów medycyny / J. Bieliński. – Warszawa: Wydanie towarzystwa lekarskiego Warszawskiego, 1889. – 907, III s.
5. *Самусик, А. Ф.* Виленские академии как центры высшего образования Беларуси (1830-е – начало 1840-х годов) / А. Ф. Самусик // Вышэйшая школа. – 2006. – № 4. – С. 48–53.
6. Полное собрание законов Российской империи: собрание 2-е с 1825 по 1881 г.: в 55 т. – СПб.: Тип. 2-го отд. собственной его император. величества канцелярии, 1830–1884.
7. Сборник постановлений по Министерству народного просвещения. – 2-е изд. – СПб.: Тип. В. С. Балашева, 1875–1876. – Т. 2. Отд. 1: Царствование императора Николая I 1825–1839 гг. – 1875. – 1576 стб., 69 с., 54 стб.; Т. 2. Отд. 2: Царствование императора Николая I 1840–1855 гг. – 1876. – 1648 стб., 107 с., 58 стб.
8. *Владимирский-Буданов, М. Ф.* История Императорского университета св. Владимира / М. Ф. Владимирский-Буданов. – Киев: Тип. Император. ун-та св. Владимира, 1884. – Т. 1: Университет св. Владимира в царствование императора Николая Павловича. – [4], 674, XLII, IV с.
9. *Łowicki, M.* Duch Akademii Wileńskiej. Z czasów Szymona Konarskiego pamiętnik ucznia Wileńskiej Akademji Medyczno-Chirurgicznej / M. Łowicki. – Wilno: Drukarnia «Zorza», 1925. – VIII, 63 s.
10. Журнал Министерства внутренних дел. – 1837. – № 10.
11. Lietuvos valstybės istorios archyvas. – F. 378. Ap. 121. Bib. 184.
12. *Wodzianowska, I.* Rzymskokatolicka Akademia duchowna w Petersburgu 1842–1918 / I. Wodzianowska. – Lublin: Towarzystwo naukowe KUL, 2007. – 319 s.



**Анатацыя**

У артыкуле разглядаюцца арганізацыйна-фінансавыя аспекты скасавання Віленскага ўніверсітэта і створаных на яго аснове медыка-хірургічнай і рымска-каталіцкай духоўнай акадэмій, якія працягвалі ўтрымлівацца пераважна за кошт мэтавых грашовых сродкаў з адукацыйнага фундуша, а не агульнадзяржаўных крыніц даходаў. У структуры выдаткаў віленскіх акадэмій асноўнае месца займалі асігнаванні для забеспячэння ўтрымання казённых студэнтаў і на аплату працы выкладчыкаў. Закрытыя па палітычных матывах віленскія акадэміі змянілі месца свайго размяшчэння і выступілі асновай для арганізацыі медыцынскага факультэта ў Кіеве і рымска-каталіцкай духоўнай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу.

**Abstract**

This article examines the organizational and financial aspects of the dissolution of Vilnius University and the established on its basis Medical-Surgical and Roman Catholic Theological Academies, which continued to be maintained mainly at the expense of targeted funds from the educational fund rather than national sources of income. In the structure of expenses of the Vilnius academies, the main place was occupied by allocations for the maintenance of state-owned students and for the remuneration of teachers. Closed for political reasons, the Vilnius academies changed their location and served as the basis for the organization of the medical faculty in Kiev and the Roman Catholic Theological Academy in St. Petersburg.